# Для прадпрымальнікаў будуць створаны ўмовы для выгаднай працы на экспарт




**Прадпрымальнікі прапанавалі разгрузіць таварныя запасы на беларускіх прадпрыемствах, але папрасілі Урад стварыць для гэтага адпаведныя ўмовы — каб працаваць на экспарт стала выгадна. І, хутчэй за ўсё, такія ўмовы будуць створаны. Пра гэта паведамілі на прэс-канферэнцыі ў Беларускім саюзе прадпрымальнікаў пасля нарады з прадстаўнікамі Урада.**

**Аляксандр КАЛІНІН, старшыня БСП,** расказаў, што прадпрымальнікі ўнеслі свае прапановы па стварэнні льготных і выгадных умоў для экспарту ІПэшнікамі беларускіх тавараў, што Урад з імі згадзіўся, і што хутка трэба чакаць адпаведнага ўказа Прэзідэнта. У прыватнасці, прадпрымальнікі прапануюць увесці сімвалічны збор за экспартную дзейнасць у памеры адной базавай велічыні за месяц, не абкладаць ніякімі падаткамі месячны даход да 1000—1200 у.а., а таксама павялічыць памер наяўных разлікаў паміж суб'ектамі гаспадарання мінімум да 300 базавых велічынь за дзень. Плюс вярнуцца да перагляду нормаў КаАП у частцы штрафаў, канфіскацый і залішніх абмежаванняў у перавозцы тавараў па тэрыторыі Беларусі.

— Сістэма на вываз тавараў павінна быць ільготнай і простай. Бо ёсць псіхалогія: калі прадпрымальнік зарабляе на хлеб з маслам, а на ікру — не, то не кожны пойдзе з-за ікры на рызыку. А будзе льготная сістэма, можна будзе пакінуць былую дзейнасць і заняцца экспартам, — лічыць Аляксандр Калінін.

У тым, што беларуская прадукцыя не залежыцца на прылаўках за мяжой, не сумняваецца **Кацярына ЧЫЖЫК, віцэ-старшыня БСП, член Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

— Беларускае за межамі рэспублікі мае добры попыт. Прычым з павагай ставяцца і да самой рэспублікі, і да тавараў. Ёсць інтарэс і ў Прыбалтыцы, і ва Украіне, і ў Казахстане. Адзінае, што тут — мытныя бар'еры. А вось Расія добрая тым, што там таксама цікавяцца нашай прадукцыяй, але няма бар'ераў.

Кацярына Чыжык кажа, што наша прадукцыя лёгкай прамысловасці разлічана не на эліту, а на сярэдні сегмент грамадзян, які вельмі значны па ўсёй Расіі, ад Масквы і далей. Яна расказала, што нават бачыла, як у Маскве на рынку турэцкія ручнікі прадавалі з надпісам «беларускія», а таксама прызналася ў любові да беларускіх тавараў:

— Наогул, я сама палюбіла беларускае таму, што яго любяць там, за мяжой. Я чую меркаванні аб беларускай прадукцыі, і ў мяне нават гонар з'явіўся, што наша прадукцыя добрая.

Аднак пры ўсім гэтым і Кацярына Чыжык, і Аляксандр Калінін папярэджваюць, што ні ў якім разе нельга забараняць прадпрымальнікам займацца імпартам і прымушаць прадаваць беларускае. Трэба проста зрабіць для экспарту беларускіх тавараў выгадныя ўмовы, паказаць іншыя магчымасці і варыянты, і прадпрымальнікі самі гэтым зоймуцца.

Дарэчы, прадстаўнікі бізнэс-супольнасці адзначылі, што крокі Урада будуць даволі радыкальнымі і ліберальнымі, таму раяць зацікаўленым прадпрымальнікам ужо цяпер прыгледзець сабе асартымент, прапановы вытворцаў, рынкі і схемы збыту, каб адразу пасля выхаду ўказа пачаць працу.

Нагадаем, што пачаткам гісторыі паслужыў ліст у Саўмін з прапановамі па стымуляванні прасоўвання індывідуальнымі прадпрымальнікамі прадукцыі лёгкай прамысловасці за подпісам Кацярыны Чыжык, дзе агучвалася гатоўнасць прадпрымальнікаў экспартаваць беларускае, а таксама перашкоды на шляху гэтай ініцыятывы. Прапановы атрымалі рэзананс у СМІ, і 27 ліпеня Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў, што дзяржава зацікаўлена ў дапамозе бізнэсменаў па рэалізацыі складскіх запасаў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ЗНАКІ МОЖНА ВЯРНУЦЬ...

**Штодзень у Дзяржаўтаінспекцыю Мінска звяртаюцца сотні грамадзян, у якіх 24 ліпеня падчас праліўнога дажджу змыла з аўтамабіляў рэгістрацыйныя знакі.**

Як паведаміла старшы дзяржаўтаінспектар аддзела тэхнічнага нагляду ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Таццяна Вальковіч, на станцыю дыягностыкі, што на праспекце Дзяржынскага, супрацоўнікі ДАІ і звычайныя грамадзяне кожны дзень прыносяць дзясяткі нумарных знакаў, вырваных з рамак вадой падчас стыхіі. На працягу дня тут чакаюць гаспадароў каля 300 рэгістрацыйных знакаў. Па тэлефоне 222 08 36 аўтаўладальнікі могуць даведацца аб наяўнасці нумарных знакаў. Вяртаюць прапажу пасля прад'яўлення тэхнічнага пашпарта на аўтамабіль з 9.00 да 17.00, перапынак на абед у гэтым падраздзяленні ДАІ — з 12.30 да 13.30.

## ...АБО АДНАВІЦЬ

**Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе мінчанам не зацягваць з аднаўленнем на аўтамабілях рэгістрацыйных знакаў, згубленых падчас моцнага дажджу 24 ліпеня.**

Як паведаміла начальнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Жанна Трайно, за кіраванне транспартным сродкам без рэгістрацыйнага знака прадугледжаны штраф ад 10 да 20 базавых велічынь. За паўторнае такое парушэнне на працягу года штраф можа скласці ад 20 да 40 базавых велічынь. Замена дзяржаўных нумарных знакаў замест згубленых з заменай тэхнічнага пашпарта на аўтамабіль ажыццяўляецца ў трох філіялах міжраённага рэгістрацыйнага аддзела ДАІ на вуліцы Ціміразева, 123 (ГД «Ждановічы»); вуліцы Сярова, 1; у пасёлку Баравая, 1 (ВЦ «Аквабел»). Юрыдычным асобам трэба звяртацца ва ўпраўленне ДАІ на праспекце Дзяржынскага, 3.

**Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».**

## У БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ ПЛАНТАЦЫІ КАВУНОЎ І ДЫНЬ?

**Кавуны і дыні ў Беларусі плануюць вырошчваць у прамысловых маштабах, паведаміў дырэктар Інстытута агароднiцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Аутка.**

У выніку даследаванняў аграрыі выбралі тры невялікія гатункі, якія падыходзяць для ўмоў Беларусі. Цяпер адпрацоўваецца тэхналогія іх вырошчвання ў Інстытуце агародніцтва НАН, а таксама ў Гомельскім, Рэчыцкім і Кобрынскім раёнах.

## У СТАЛІЦЫ З'ЯВІЦЦА СВАЯ ЭЛЕКТРЫЧКА

**Беларуская чыгунка плануе запусціць у Мінску сучасную гарадскую электрычку. Пра гэта паведаміў начальнік Беларускай чыгункі Анатоль Сівак.**

«Мы цяпер вядзём разлікі па праекце стварэння мінскай гарадской электрычкі. Разглядаем участак ад станцыі Ждановічы да станцыі Мінск-пасажырскі», — сказаў начальнік БЧ. Рэгулярнасць руху складзе каля 10 хвілін. Па маршруце будуць хадзіць сучасныя цягнікі з некалькімі ўваходамі і выхадамі.

**БЕЛТА.**

## ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ ЮРЫЙ КУРНЕНІН



**Учора раніцай на 56-м годзе жыцця памёр чэмпіён Савецкага Саюза па футболе Юрый Курненін. Пасля вяртання з чэмпіянату Еўропы ў Швецыі, дзе Юрый Анатольевіч быў галоўным трэнерам моладзевай зборнай Беларусі, месяц ён нідзе не працаваў, а памёр у сне...**

Юрый Курненін нарадзіўся 14 чэрвеня 1954 года ў Арэхава-Зуеве Маскоўскай вобласці. Выхаванец ДЮСШ «Знамя працы». Як гулец выступаў за маскоўскае «Дынама» (1972—75), прычым нападаючым, і мінскае «Дынама» (1976—87), дзе перакваліфікаваўся ў абаронцу. Майстар спорту СССР. Чэмпіён (1982) і бронзавы прызёр (1983) чэмпіянатаў СССР. У вышэйшай лізе чэмпіянатаў СССР правёў 256 матчаў, забіў 19 галоў (у тым ліку ў мінскім «Дынама» — 248/17). Тройчы ўключаўся ў спіс 33 лепшых футбалістаў СССР (1982, 1983, 1984). Першы савецкі абаронца, які здзейсніў галявы хет-трык (30 кастрычніка 1982 года, у хатнім матчы супраць алмаацінскага «Кайрата» — 3:2). Аўтар першага еўракубкавага гола беларускіх клубаў (14 верасня 1983 года, у хатнім матчы 1/16 фіналу Кубка чэмпіёнаў супраць швейцарскага «Грасхопера» — 1:0). У 1989 годзе скончыў Вышэйшую школу трэнераў у Маскве. Трэнерскую кар'еру пачаў у віцебскім КІМе (1989—90), затым узначаліў брэсцкае «Дынама» (1991—92), ніжнявартаўскі «Саматлор XXI» (1993—94), нацыянальную зборную Сірыі (1995—96), клуб «Аль-Ахлі» са сталіцы Амана. У 1998 годзе працаваў у трэнерскім штабе мінскага «Дынама», а з 1999 г. па сярэдзіну 2000 г. — на пасадзе галоўнага трэнера гэтай каманды. У 2001 годзе ўваходзіў у трэнерскі штаб новарасійскага «Чарнаморца», у 2003 г. — салігорскага «Шахцёра» і мінскага «Дынама». Са жніўня 2003 г. па канец 2005 г. дапамагаў Анатолю Байдачнаму ў рабоце з нацыянальнай зборнай Беларусі. У 2006 годзе прызначаны галоўным трэнерам моладзевай зборнай Беларусі, з якой працаваў да завяршэння нядаўняга чэмпіянату Еўропы. Найвышэйшыя трэнерскія дасягненні — бронза брэсцкага «Дынама» ў чэмпіянаце Беларусі (1992), вывад зборнай Сірыі ў фінальны турнір Кубка Азіі (1995—96) і вывад моладзевай зборнай Беларусі ў фінальны турнір чэмпіянату Еўропы (2007—09).

Сёння ў Мінск вернецца жонка Юрыя Анатольевіча, пасля чаго стане вядома пра грамадзянскую паніхіду і месца пахавання.

## АЛЯКСАНДР ГЛЕБ ТАМ, ДЗЕ ПАЧЫНАЎ

Паўабаронца нацыянальнай зборнай па футболе Аляксандр Глеб вярнуўся ў клуб, дзе ў 2000-м пачынаў сваю еўрапейскую кар'еру. «Барселона» меркавала свайго форварда Самюэля Это'О абмяняць на нападаючага «Інтэра» Златана Ібрагімавіча, а да Это'О дадаць яшчэ і Глеба. Аднак потым было вырашана замест Глеба суму кампенсацыі за Ібрагімавіча павялічыць на тры мільёны еўра, а наш суайчыннік абраў варыянт са «Штутгартам». Сума арэнды Глеба вагаецца ад 8 да 10 мільёнаў еўра, тэрмін — дзесяць месяцаў без права выкупу.

## ВІКТАР ГАНЧАРЭНКА: БУДЗЕМ РАЗБІРАЦЦА

З паражэння ў гасцях 0:1 ад латвійскага «Ветспілса» пачаў трэці кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ. БАТЭ саступіў «Вентспілсу» ў адзінаборствах і жаданні, заявіў галоўны трэнер барысаўскай каманды Віктар Ганчарэнка пасля матчу. «У пэўнай ступені гэта стала для мяне адкрыццём. Будзем разбірацца», — заявіў трэнер БАТЭ.

Вось астатнія вынікі матчаў трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў. «Спортынг» (Партугалія) — «Твентэ» (Галандыя) — 0:0; «Левадыя» (Эстонія) — «Дзебрэцэн» (Венгрыя) — 0:1; «Апаэль» (Кіпр) — «Партызан» (Сербія) — 2:0; «Шахцёр» (Украіна) — «Цімішаара» (Румынія); «Слован» (Славакія) — «Алімпіякас» (Грэцыя) — 0:2; «Капенгаген» (Данія) — «Стабек» (Нарвегія) — 3:1; «Цюрых» (Швейцарыя) — «Марыбор» (Славенія) — 2:3; «Рэд Бул Зальцбург» (Аўстрыя) — «Дынама» (Харватыя) — 1:1; «Баку» (Азербайджан) — «Леўскі» (Балгарыя) — 0:0; «Актобе» (Казахстан) — «Маккабі» (Ізраіль) — 0:0; «Спарта» (Чэхія) — «Паніцінаікас» (Грэцыя) — 3:1; «Андэрлехт» (Бельгія) — «Сіваспо» (Турцыя) — 5:0.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Абзац

◢ **Нацыянальная кампанія «Белавія» на новым рэйсе Мінск—Амстэрдам—Мінск з 27 ліпеня знізіла тарыф у абодва бакі да 249 еўра. З улікам усіх збораў кошт палёту складзе 298 еўра, што на 31 еўра таннейшае за раней вызначаны тарыф. Адкрыццё рэгулярнага авіямаршруту паміж дзвюма сталіцамі адбудзецца 10 жніўня г.г.**

◢ Смяротны выпадак адбыўся на Магілёўскім заводзе «Газасілікат», паведаміў канал АНТ. 49-гадовы працаўнік трапіў пад прэс і праз некалькі гадзін памёр у бальніцы. На прадпрыемстве працуюць спецыялісты дзяржінспекцыі працы, у якіх шмат пытанняў. Як высветлілася, падчас абедзеннага перапынку начальнік змены вырашыў праверыць працу машыны для вытворчасці сілікатных блокаў і не заўважыў, што там знаходзіцца рабочы. Пра інцыдэнт у інспекцыю працы паведамілі толькі на наступны дзень. Не выключана, што будзе пачата крымінальная справа.

◢ **Супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі члена прыёмнай камісіі Белдзяржуніверсітэта фізічнай культуры падчас атрымання 1 тыс. долараў. Затрыманая сцвярджала, што хабар быццам бы меркаваўся для перадачы пасадавым асобам БДУФК за станоўчае вырашэнне пытання аб здачы прафілюючага экзамену па фізкультуры. Заведзена крымінальная справа па артыкуле аб падбухторванні да хабару. Падазроная змешчаная ў ізалятар часовага ўтрымання. Па словах праваахоўнікаў, гэта першы падобны выпадак у сёлетняй уступнай кампаніі.**

## Поўны абзац

◢ **Падчас перапісу насельніцтва ў Мексіцы выяўлены жыхар, імя якога складаецца з 41 літары. Як сцвярджаюць тамтэйшыя СМІ, мексіканец Брхадараньякопанішадвівекачудамані Эррэ Муньёс-Лопес мае самае доўгае імя ў сваім штаце і мог бы трапіць у Кнігу рэкордаў Гінэса. Першыя два словы складае імя. Яно пераводзіцца як «сапраўдны, чысты чалавек». Такое складанае імя мексіканцу прыдумаў яго бацька, які захапляўся чытаннем індыйскай літаратуры.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. БРЕСТЕ

| Адрес участка/ кадастровый номер | ул. 2-я Белорусская, № 14010000000 1019335 | ул. Шоссейная, № 14010000000 1020247 | мкрн. «Вулька-1», ул. Рябиновая, № 14010000000 1014415 | ул. Учительская (р-н д. Митьки) № 14010000000 1020986 | ул. В. Интернационалистов, 19 № 14010000000 1019530 | ул. л-та Рябцева (в р-не станции Брест-Северный) № 14010000000 1020436 | ул. л-та Рябцева (р-н старого аэропорта) № 14010000000 1020148 | ул. В. Интернационалистов, 23 № 14010000000 1019531 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № лота | 1* | 2* | 3* | 4* | 5* | 6* | 7* | 8* |
| Начальная цена продажи (руб.) | 140 622 262 | 33 179 042 | 31 789 154 | 4 908 109 | 29 756 431 | 182 560 643 | 114 704 023 | 36 301 217 |
| Сумма задатка (руб.) | 14 000 000 | 3 317 000 | 3 178 000 | 490 000 | 2 975 000 | 18 256 000 | 11 470 000 | 3 630 000 |
| Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | 1 450 817 | 1 663 968 | 1 235 300 | 1 267 661 | 5 795 970 | 1 541 102 | 1 216 304 | 5 810 313 |
| Общая площадь (га) | 0,8704 | 0,1079 | 0,0684 | 0,0160 | 0,0673 | 1,2869 | 0,2835 | 0,1056 |
| Срок аренды | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет |
| Целевое назначение | строительство и обслуживание объекта производственного назначения | строительство и обслуживание объекта общественного питания | строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров | строительство и обслуживание объекта торговли | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | строительство и обслуживание объекта производственного назначения | строительство и обслуживание объекта административно-хозяйственного назначения | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания |
| Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке | 0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления | - 0,0190 га – охранная зона санитарно-защитная полоса водоводов и водопроводов 0,0047 га – охранная зона газопровода среднего давления | 0,0146 га – охранная зона газопроводанизкого давления 0,0160 га – охранная зона напорной канализации | ограничений в использовании земель нет | 0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления | ограничений в использовании земель нет | ограничений в использовании земель нет | ограничений в использовании земель нет |
| Адрес участка/ кадастровый номер | ул. Октябрьской революции – ул. 28 Июля № 14010000000 1020990 | ул. Волгоградская в районе рынка «Ковалево» № 14010000000 1020989 | район индивидуальной застройки «Вычулки-Ямно» № 140100000001021 585 | район ул. Коммерческая № 14010000000102 2617 | «ЮЗМР-4» № 18а по ГП № 1401000000010 22681 | «ЮЗМР-4» № 19а по ГП № 140100000001022 682 | район ул. М.Л. Мошенского № 1401000000010 23680 | пересечение б. Шевченко и Варшавского шоссе № 14010000000 1023681 |
| № лота | 9* | 10* | 11* | 12* | 13* | 14* | 15 | 16 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 1 474 838 992 | 228 628 011 | 373 957 964 | 323 312 090 | 47 824 428 | 42 747 422 | 23 100 935 | 794 393 098 |
| Сумма задатка (руб.) | 147 483 000 | 22 862 000 | 37 395 000 | 32 330 000 | 4 780 000 | 4 270 000 | 2 310 000 | 79 439 000 |
| Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | 3 178 097 | 1 429 481 | 2 636 253 | – | 755 221 | 739 422 | 675 127 | 2 099 256 |
| Общая площадь (га) | 3,5375 | 0,4910 | 2,0631 | 1,7760 | 0,1234 | 0,1103 | 0,1210 | 2,8605 |
| Срок аренды | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 25 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет |
| Целевое назначение | строительство и обслуживание объекта торгово-развлекательного назначения, административного назначения, гостиницы с условием создания на прилегающей территории ландшафтно-рекреационной зоны | строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров | строительство и обслуживание объекта многофункционального назначения | строительство логистического центра | строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров | строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров | строительство и обслуживание автомобильной мойки | строительство и обслуживание объекта торгово-административного назначения |
| Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке | ограничений в использовании земель нет | 0,0435 га – охранная зона газопровода высокого давления | 0,3305 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10 киловольт; 0,2105 га – охранная зона подземных кабельных линий связи; 0,0240 га – охранная зона воздушных и кабельных линий радиофикации; | ограничений в использовании земель нет | ограничений в использовании земель нет | ограничений в использовании земель нет | ограничений в использовании земель нет | ограничений в использовании земель нет |

***- повторные аукционные торги**

**Дополнительное условие по лоту № 11** – возмещение потерь с/х производства в сумме 26 094 700 рублей, вызванных изъятием 2,0631 га пахотных земель
**по лоту № 12** – возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией в отношении создании земельного участка и потерь с/х производства в сумме 15 705 400 рублей

**Условия продажи:** - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение расходов, связанных с подготовкой земельно-кадастровой документации и гос. регистрации в отношении создания зем. участков, по лотам 11, 12 возмещение потерь с/х производства; - заключение с Брестским горисполкомом договора аренды зем. участка и осуществление в двух месячный срок после принятия решения о предоставлении участка гос. регистрации прав на него; - начало освоения зем. участка в течение 6 месяцев с даты проведения аукциона и подписания протокола о его результатах; - получение в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта, в срок, не превышающий 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие плодородного слоя почвы и использование его для нужд, связанных со строительством объекта и на благоустройство г. Бреста

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924. Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.** Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2-х участников. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона обязан:**● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка; ● заключить с Брестским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским городским исполнительным комитетом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком утвержденным решением горисполкома. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты принятия решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих соглашениях о правах и обязанностях сторон.

**Аукцион состоится 18 сентября 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 31.07.2009 г. до 17.30 14.09.2009 г. по адресу:**
**г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

## ЗНАХАР



**Знахар (знахарка, лекарка) — чалавек з пэўнымі здольнасцямі лячыць людзей, жывёлу, здольны ахоўваць ад варажбы і сурокаў, прадказваць будучыню, валодаць звышнатуральнымі, магічнымі ведамі, выконваць магічныя рытуальныя дзеянні.**

● Таго, хто выкарыстоўваў у сваёй лекарскай практыцы толькі травы, у народзе звалі траўнікамі.

● Знахар стаяў у адным шэрагу з калдунамі, ведзьмакамі, але лічылася, што знахар не кантактаваў з нячыстай сілай. У сваёй рабоце ён выкарыстоўваў замовы і малітвы, лекавыя травы, карані, сілу і энергетыку вады і іншыя магічныя рэчы, надзеленыя ў культуры сакральнасцю.

● Знахар заўсёды насіў крыж на целе і хрысціўся перад тым, як пачаць сваю работу.

● Знахары паспяхова лячылі таксама псіхічныя захворванні: спалохі, эпілепсію («падучую», ці «чорную» хваробу).

● Да знахароў заўсёды было дваякае стаўленне. З аднаго боку, да іх заўсёды прыходзілі з надзеяй на выратаванне, звярталіся па дапамогу ў час засухі ці, наадварот, працяглых дажджоў, у іх прасілі дапамогі ў каханні і сямейным шчасці. З другога боку, у народзе лічылі, што таксама, як і калдуны, знахары не абыходзяцца без падтрымкі нячыстай сілы.

● Лічылася, што веды такога кшталту перадаюцца нашчадкам, прычым па матулінай ці бацькоўскай лініі: ад дзеда да бацькі, ад бацькі да сына, унука і г.д.

● Лепшымі знахаркамі лічылі «чыстых» жанчын: сталых, удоў, а таксама тых, хто нарадзіўся ў панядзелак ці пасля смерці бацькі.

● Каб выканаць тыя ці іншыя рытуальныя дзеянні, знахары выбіралі спрыяльны час: напрыклад, суботу — «як субота заканчвае тыдзень, так і хвароба закончыцца»; стан месяца на небе (каб прыбывала — выкарыстоўвалі «маладзік», каб адыходзіла — «збыта»); усход ці захад сонца. У той жа час строга прытрымліваліся правіла не займацца «такой» справай у пост і вялікія царкоўныя і народныя святы.

● Акрамя гэтага, выбіралі месца правядзення абраду. Часцей за ўсё гэта было месца каля вады, ручая, калодзежа, на скрыжаванні шляхоў, там, дзе не будуць хадзіць людзі і свойская жывёла.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

— У мяне кот з балкона птушак ловіць.
— Ну і як?
— Лік 4:2 на яго карысць.
— Што, зваліўся два разы?
— Ды не, зваліўся ён усе шэсць разоў, але два разы птушку не злавіў...

☺

**Па шматлікіх просьбах радыёслухачоў песня выконваецца ў апошні раз.**

☺

— Як можна трымацца далей ад чаркі?
— Піце гарэлку праз саломінку.

☺

**Народная цэлюлітніца Марыя Патапава лечыць няўпэўненасць у сабе метадам візуальных параўнанняў.**




## НЯМЕЦКІ ШУКАЛЬНІК СКАРБАЎ ЗНАЙШОЎ ЗАТАНУЛЫ ПІРАЦКІ КАРАБЕЛЬ З ЗОЛАТАМ

**Клаўс Кеплер, 70-гадовы нямецкі паляўнічы на скарбы, знайшоў ля берагоў Інданезіі затанулае пірацкае судна Forbes з грузам золата, срэбра, каштоўных камянёў, крышталю і кітайскага фарфору дынастыі Мін, перадаюць інфармагенцтвы.**

Агульная вага скарбу складае каля паўтары тоны, а яго кошт, паводле розных звестак, вагаецца ад 7 млн да 10 млн еўра. Палову гэтай сумы Кеплер павінен аддаць інданезійскаму ўраду.

Пры гэтым на пошукі затанулага карабля Клаўс Кеплер і яго кампаньён з Дрэздэна Марцін Венцэль патрацілі каля 3 млн еўра. Адзін толькі пад'ём судна абышоўся ў 600 тыс. еўра.

Брытанскае каперскае судна Forbes патанула ў 1806 годзе, наляцеўшы на рыф Мампанга паміж Барнеа і Суматрай. Капітану Фрэзеру Сінклеру і камандзе ўдалося выратавацца, аднак скарб патануў. Акрамя каштоўнасцяў на караблі былі знойдзены 400 бутэлек віна.

Клаўс Кеплер з'яўляецца самым паспяховым шукальнікам скарбаў Германіі. Свой першы карабель — рымскую галеру 34 года да н.э. з 1500 амфарамі на борце — ён знайшоў у 20 гадоў. Пасля гэтага Кеплер стаў прафесійна займацца пошукамі скарбаў. Разам са сваёй камандай яму, у прыватнасці, удалося знайсці галандскае судна Waterdrinker, на борце якога знаходзілася 30 т серабра ў злітках, 200 тыс. залатых і сярэбраных манет, а таксама мармуровы конь пад залатым сядлом. Кошт знаходкі склаў 25 млн еўра.

**БЕЛТА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.22 | 21.09 | 15.47 |
| Віцебск — | 5.05 | 21.05 | 16.00 |
| Магілёў — | 5.12 | 20.59 | 15.47 |
| Гомель — | 5.15 | 20.49 | 15.34 |
| Брэст — | 5.38 | 21.24 | 15.46 |
| Гродна — | 5.45 | 21.18 | 15.33 |

**Месяц**
*Першая квадра. Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**
***Пр.*** *Емяльяна, Івана.*
***К.*** *Алены, Ігната, Любаміра, Рамана.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты — 31 ліпеня



**1802 год** — нарадзіўся Ігнат Інапалітавіч Дамейка, вядомы беларускі геолаг, мінеролаг. У 1822 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. У 1838 годзе, даведаўшыся, што Чылійскай рэспубліцы патрэбныя выкладчыкі хіміі і мінералогіі, аформіў кантракт на 6 гадоў з урадам гэтай краіны. Вучоны і не падазраваў, што яго знаходжанне ў Чылі прадоўжыцца 46 гадоў, і што гэта краіна стане для яго другой радзімай. Тут ён адкрыў салетру, знайшоў залежы золата, серабра, медзі і каменнага вугалю. Выявіўшы ў гарах крыніцу чыстай вады, ён пабудаваў водаправод і забяспечыў вадой Сант'яга. Стварыў у Чылі мінералагічны музей і бібліятэку прыродазнаўства. Ажыццявіў навуковыя экспедыцыі ў Анды, зрабіў мноства адкрыццяў, часам рызыкуючы жыццём. Як вынік, у навуковых атласах з'явіліся невядомы раней мінерал дамейкіт, выкапнёвы слімак і фіялка. Ён карэнным чынам змяніў сістэму адукацыі ў Чылі, напісаў падручнікі па мінералогіі і фізіцы, увёў у краіне метрычную сістэму. У 1867-1883 гадах з'яўляўся рэктарам універсітэта ў Сант'яга. У 1884-м І.Дамейка наведаў радзіму. Памёр у 1889 годзе. У яго гонар чылійскі ўрад выпусціў памятны залаты медаль, а таксама назваў яго імем горад і марскі порт. Пасля смерці Ігнат Дамейка быў абвешчаны нацыянальным героем, а ў сталіцы Чылі ўстаноўлены помнік «Вялікаму асветніку».

**1956 год** — ЦК КПСС прыняў рашэнні аб развіцці жыллёвага будаўніцтва ў СССР — пачатак эпохі «хрушчовак».

## Цытата дня

*«Чаму людзі ідуць за большасцю? Думаеце, таму, што яна мае рацыю? Не — таму, што яна моцная!».*

**Блез Паскаль (1623—1662), французскі матэматык, фізік, рэлігійны філосаф.**

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

31 ЛІПЕНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 28 (15582)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# ПОПЫТ І ПРАПАНОВЫ НА ШКОЛЬНЫМ КІРМАШЫ



**Напярэдадні новага навучальнага года перад бацькамі першакласнікаў узнікае заканамернае пытанне: колькі каштуе адправіць дзіця ў школу? Для таго, каб знайсці адказ, прапаную завітаць на школьны кірмаш. Сёлета асартымент дастаткова вялікі, пачынаючы ад беларускіх вытворцаў і заканчваючы агульнавядомымі брэндамі.**

Спіс прынадлежнасцяў для вучняў першага класа невялікі, але і зусім нятанны. Паспрабуем падлічыць сярэднюю суму, якую неабходна патраціць на «провады» дзіцяці першы раз у першы клас.

Распачнём падлік з самага неабходнага — канцылярскіх тавараў: сшыткі для працы на ўроках — 370 рублёў, альбом для малявання — 2500—4700 рублёў, акварэльныя фарбы — 3160 або гуаш — 12300—15 000 рублёў, пэндзлі — 700—840 рублёў (у залежнасці ад якасці і даўжыні), пласцілін — 2150—7500 рублёў, каса літар і складоў на рускай і беларускай мовах — 3740 рублёў, палачкі для падліку абыдуцца ў паўтары тысячы — і гэта далёка не ўвесь спіс. Таксама дадайце рознакаляровую паперу (2300—5700 рублёў) і кардон (2500—6980), нажніцы (3230—7200), клей (1200—2600), лінейку (640—1200), просты аловак (490), ручку (450—1700), пенал (2500—11510 ), гумку (340—680), тачылку (580—960), алоўкі для малявання (2500—3600), фламастары (4900—6100), крэйду (930—1640), і каб усё вышэй названае было ў чым да школы данесці — партфель (44 000—67 000). Да таго ж абавязкова патрэбна школьная форма: кашуля для хлопчыка каштуе 17 160—20 740, кашуля для дзяўчынкі ўжо даражэйшая — 45 000—76 000, штаны— 32 000—74 000, спадніца — 40 000—85 000, сарафан — 65 000, камізэлька — 28 000—36 000, пінжак — 60 000—92 000, гальштук — 4100—6900, кошт абутку складае прыблізна 45 000—120 000 рублёў, але варта ўлічыць некалькі сезонаў і надвор'е. Таксама для заняткаў па фізкультурай патрабуецца спартыўная форма: звычайна гэта майка (5700—12 300), касцюм (29 000—56 000), абутак (15 000—35 000), у некаторых выпадках патрабуюцца чэшкі (10 000).

Такім чынам, для таго, каб адправіць у школу першакласніка, неабходна заплаціць каля 500 000 беларускіх рублёў — і гэта яшчэ не ўсё, бо кожны настаўнік можа дадаць яшчэ што-небудзь неабходнае, што складае неад'емную частку навучальнага працэсу. Таксама нельга не ўлічыць кошт падручнікаў, які вагаецца ў залежнасці ад класа і мовы навучання.

**Наталля ГАЛІЕЎСКАЯ, фота аўтара.**

Рыштаванні Бацькаўшчыны

# «РЭКАНСТРУКЦЫЯ КОСАВА ІДЗЕ ЗГОДНА З ПЛАНАМ!»

## ...і скончыцца ў 2011 годзе

*Карэспандэнт «ЧЗ» даведаўся пра ход рэстаўрацыйных работ*

Лета 2011 года абяцае быць сапраўдным «адраджэнскім», бо менавіта тады некаторыя са шматлікіх, некалі занядбаных гісторыка-культурных аб'ектаў будуць цалкам адноўленыя. Сярод лаўрэатаў на адкрыццё стаіць і самы маленькі беларускі горад, які часам блытаюць з сербскім цёзкам, — Косава. Сам гарадскі палац быў пабудаваны ў XIX стагоддзі па замове князёў Пуслоўскіх. У час жа Вялікай Айчыннай ён быў спалены, аднак ад яго засталіся амаль некранутыя рэшткі: падавалася, дастаткова толькі ўсталяваць вокны і ачысціць падзямелле. З гэтай прычыны нават станавілася незразумелым, чаму рэстаўратары спярша ўзяліся за Мірскі замак, які па ўзроўні цэласці быў далёка ззаду Косаўскага палаца. Але, як кажуць, усё папраўна, бо ў 2008 годзе чарга дайшла і да гэтага палаца...

У самы маленькі беларускі горад «Звязда» завітала а 7-й раніцы. Працоўны дзень пачынаецца толькі праз гадзіну, а таму нам выпала цудоўная магчымасць пахадзіць па рэштках палаца і паназіраць непасрэдна за ходой рэстаўрацыйных работ знутры. На дзіва, узнаўленне ідзе без пэўных хібаў, што не скажаш пра Нясвіж ды Мір — відаць, гэтым разам за справу ўзяліся сапраўдныя прафесіяналы. Парадавала і тое, што для рэканструкцыі выкарыстоўваецца дэкаратыўная цэгла сапраўднага гістарычнага памеру, з якой індывідуальна выразаюць неабходныя формы. Гэта вельмі важна, бо на некаторых іншых аб'ектах параметры будаўнічых матэрыялаў падбіраліся наўскідку, часам нават не звяртаючыся да гістарычных дакументаў.

Адразу было бачна, што праца праведзеная вельмі вялікая: за палацам знаходзілася велізарная куча пяску, які працаўнікам даводзілася ўручную выкопваць з ніжніх паверхаў. Там можна было пабачыць і дошку, на якой роўненька былі складзены каштоўныя сховішчы палаца: рэшткі куфля, шкла — напэўна, праз некалькі годоў яны зоймуць месца ў косаўскім музеі. Унутры ж ледзь не ва ўсіх пакоях умацаваны дах і дол, у адным крыле нават ужо з'явілася лесвіца. Насуперак забараняльнай шыльдзе на ўваходзе, здавалася, што палац зусім не ў аварыйным стане, а ўжо нават больш трывалы, чым большасць беларускіх архітэктурных помнікаў. Зацікавілі і будаўнічыя матэрыялы: аказалася, што ўся рэстаўрацыйная праца ідзе на беларускіх вырабах — краснасельскім цэменце. На трэцім жа паверсе, дзе пакуль неставала даху, давялося пабачыць нават «сайдынг» — адразу ўзніклі пытанні, нашто ў старадаўнім палацы пластмасавае аздабленне...

Але ўсе гэтыя развагі былі прыпынены пачаткам працы: сапраўды, роўна а 8-й гадзіне рабочыя, праслухаўшы дзённы інструктаж, пачалі ўзнаўленчыя працы. Нам жа давялося паразмаўляць са спадаром **Міхалам БЯЛЬКО, прарабам ААТ «Брэстрэстаўрацыя»**, які займаецца арганізацыяй узнаўленчых работ па палацы Пуслоўскага:

— Працуе ў нас 20 чалавек, уся праца разбіта па плане — пакуль усё паводле яго. Рэканструкцыя аб'екта ідзе згодна з выдзеленымі грашыма. Напрыклад, сёлета выдзелена 1 мільярд 200 мільёнаў рублёў, хоць на ўсю пабудову трэба 22 мільярды. Але, скажам, на гэты год у нас дастаткова грошай, бо мы выбралі такія работы, дзе мала грошай ідзе на будаўнічыя матэрыялы.

**— Міхал Мікалаевіч, вы ўзнаўляеце палац згодна з гістарычнымі звесткамі. На што дакладна вы арыентаваліся?**

— Ёсць праект. Ён называецца «Рэстаўрацыя і прыстасаванні», гэта значыць, узнаўленне поўнасцю вонкавага выгляду аб'екта, навакольнага парку. Рэстаўрацыя падзеленая на тры чаргі. У першую чаргу, маналітнае перакрыцце, узмацненне гідраізаляцыі фундамента, дах ды сцены — гэта тое, што запланавана на тры гады (да 2011. — **Аўт.**). Другая чарга — гэта ўнутраныя работы: сценка, аздабленне, інжынерныя сеткі. А трэцяя чарга — узнаўленне страчаных формаў: уязная брама, прывядзенне парку да ладу (велізарная тэрыторыя). Такім чынам, можна сказаць, праца на ўсё жыццё: дакладнай даты заканчэння трэцяй чаргі нават яшчэ ў планах няма.

**— І як на сёння ідзе ўзнаўленне палаца?**

— Мы ўжо заканчваем рэстаўрацыю першай чаргі ў левым крыле (тут будзе пяць пакояў гасцінічнага комплексу). Там ужо ўсё па-новаму: іншая планіроўка, фундаменты заліты, сцены, засталося толькі дах пакласці (метал ужо замоўлены), пагрунтаваць ды пафарбаваць сцены. Думаю, да снежня працы ў гэтым крыле мы скончым: адно, мабыць, вокны плёнкай закрыем... Ну, калі казаць карацей, рэканструкцыя ідзе згодна з планам!..

Варта сказаць, што будучае размяшчэнне пакояў таксама выбраны даволі слушна, бо ў палацы будзе і гасцініца, і музей, і канферэнц-зала, і гаспадарчыя пакоі (дакладныя месцы размяшчэння глядзіце на фота) — як кажуць, трэба і культурную спадчыну пакінуць, і прыбытак яшчэ атрымоўваць. Хочацца верыць, што рэканструкцыя палаца Пуслоўскіх пройдзе на годным узроўні. Сапраўды, калі глядзіш на макет будучага заканчэння, проста зачароўвае: парыжскія Елісейскія палі ў маленькім горадзе Косаве з фантанамі, возерам і паркам, прыведзеным да ладу, бо на сёння нядаўна пасаджаныя дрэвы сапсуюць выгляд палаца з дарогі. А за ўсім гэтым і само Косава расквітнее, бо турысты замест Міра-Нясвіжа будуць аддаваць перавагу гэтаму цудоўнаму мястэчку!

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**
**Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.**




**ДЗЕ І ШТО БУДЗЕ?**
**1 — Пяціпакаёвая гасцініца**
**2 — Бар на 36 месцаў**
**3 — Гасцінічныя апартаменты**
**4 — Музей**
**5 — Канферэнц-зала**
**6 — Гаспадарча-бытавыя памяшканні**
**7 — Зала на 80 месцаў.**

## Стыпендыя ў будучых супрацоўнікаў беларускай АЭС павялічыцца

**Адным з асноўных гарантаў бяспекі эксплуатацыі атамнай станцыі з'яўляецца высокі прафесіяналізм персаналу, які яе абслугоўвае. Значную ўвагу пытанню падрыхтоўкі сваіх айчынных спецыялістаў надае і Беларусь.**

Як патлумачыў **начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Юрый МІКСЮК**, летась была прынята адпаведная дзяржаўная праграма, дзе дэталёва прапісаны ўсе мерапрыемствы нарматыўна-прававога і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, міжнароднага супрацоўніцтва і г.д.

У мінулым годзе айчынныя ВНУ і ССНУ правялі першы набор на спецыяльнасці, звязаныя з ядзернай энергетыкай. Сёлета прайшоў другі набор. «Мы можам канстатаваць, што на ўсе спецыяльнасці, звязаныя з будаўніцтвам і эксплуатацыяй АЭС, існуе конкурс, — адзначыў Юрый Міксюк. — У розных навучальных установах ён розны. Напрыклад, на факультэт ядзернай фізікі БДУ конкурс склаў 1,5 чалавека на месца. Сама па сабе гэтая лічба — не паказчык, паказчыкам з'яўляецца прахадны бал, а ён быў даволі высокім — 245. У БНТУ на энергетычны факультэт прахадны бал быў 270. Сюды ідуць моцныя абітурыенты, для нас гэта важна».

Паводле яго слоў, Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам эканомікі і Міністэрствам фінансаў прыняло пастанову, у адпаведнасці з якой суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях, звязаных з ядзернай энергетыкай, цяпер складаюць 1 да 6 (у сярэднім па краіне гэты паказчык — 1 да 10). На стадыі прыняцця пастанова аб павелічэнні стыпендыі для студэнтаў чатырох асноўных спецыяльнасцяў, «завязаных» на будучай беларускай АЭС. Цяпер вырашаецца пытанне канкрэтнага памеру павелічэння (на 30 ці на 50 працэнтаў).

Вучэбныя планы, па якіх навучаюцца нашы будучыя супрацоўнікі АЭС, распрацаваны з улікам сусветнай практыкі падрыхтоўкі кадраў для атамнай энергетыкі. Па асобных спецыяльнасцях, звязаных з эксплуатацыяй ядзерна-энергетычных установак, тэрмін навучання павялічаны на паўгода — да 5,5 года.

Вельмі важным застаецца пытанне практычнай падрыхтоўкі. Сёння мы пакуль не маем адпаведнага аб'екта на сваёй тэрыторыі. Стварэнне вучэбна-трэніровачнага цэнтра плануецца пры самой атамнай станцыі. Беларускія ВНУ вядуць перамовы з ВНУ Расійскай Федэрацыі аб арганізацыі праходжання практыкі беларускіх студэнтаў. Папярэднія дамоўленасці ўжо існуюць. Паралельна вядзецца абсталяванне вучэбнага цэнтра на базе Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных праблем «Сосны».Самі выкладчыкі профільных дысцыплін асобных беларускіх ВНУ прайшлі стажыроўку на дзейных атамных станцыях Расійскай Федэрацыі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

Аляксандр ЖУК:

## «Адметнай асаблівасцю ўступных кампаній апошніх гадоў стала зніжэнне конкурсу на бюджэтныя месцы»

**Асабліва гэта заўважна на прыкладзе ўступных кампаній 2008 і 2009 гадоў, — адзначыў першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук.**

Тлумачэнне гэтаму простае: вызначальнымі тут з'яўляюцца прахадныя і набраныя балы. «Калі на спецыяльнасць набіраюць усяго 10 чалавек і з усіх ахвотных паступіць 8 абітурыентаў маюць па тры сертыфікаты з агульным лікам балаў вышэй за 300—350, то абітурыенты, у якіх, напрыклад, 150—250 балаў, на гэту спецыяльнасць дакументы падаваць не будуць. А значыць і конкурсу таксама не будзе», — растлумачыў Аляксандр Жук.

Конкурс узнікаў з-за таго, што дакументы падаваліся «ўсляпую». Цяпер жа звесткі пра заявы, якія паступілі, абнаўляюцца на стэндах у ВНУ і на сайтах кожныя тры гадзіны. Такім чынам, усе абітурыенты могуць бачыць, колькі заяў пададзена на тую ці іншую спецыяльнасць, а таксама агульную колькасць балаў кожнага абітурыента.

У якасці прыкладу Аляксандр Жук прывёў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Тут, напрыклад, сёлета сярэдні конкурс па ВНУ склаў усяго 1,6, пры гэтым на палову спецыяльнасцяў прыйшлі абітурыенты з сертыфікатамі ЦТ ад 300 і вышэй. На некаторыя факультэты ВНУ прахадныя балы выраслі на 15—20 пунктаў.

Паводле папярэдніх звестак, прахадныя балы павялічыліся таксама ў БДЭУ, БДУ і іншых вышэйшых навучальных установах на многіх факультэтах.

Нагадаем, што 25 ліпеня быў апошні дзень прыёму дакументаў ад абітурыентаў у ВНУ другога патоку на бюджэтныя месцы дзённых аддзяленняў. На тыя факультэты, дзе прымалі тры сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання, залічэнне ўжо праведзена.

На тых факультэтах, дзе праходзяць экзамены ўнутры ВНУ па творчых дысцыплінах (малюнак, музыка, танец, сачыненне і інш.), літаратуры і фізічнай культуры, залічэнне будзе зроблена пасля правядзення гэтых экзаменаў. Праграмы ўступных іспытаў былі выдадзены і апублікаваны за паўгода да ўступнай кампаніі, так што ўсе пытанні і тэмы павінны быць знаёмыя абітурыентам. Залічэнне абітурыентаў на бюджэтныя аддзяленні ў ВНУ другога патоку пройдзе па 1 жніўня, залічваць платнікаў будуць па 6 жніўня ўключна.

**Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.**

Ведай нашых

## Багдан Ранішэнка заваяваў золата на міжнароднай хімічнай алімпіядзе ў Оксфардзе

**Залаты медаль на 41-й міжнароднай хімічнай алімпіядзе заваяваў выпускнік сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 12 Гомеля Багдан Ранішэнка, паведамілі ва ўпраўленні адукацыі Гомельскага аблвыканкама. Напярэдадні ў складзе беларускай каманды ён вярнуўся з Оксфарда (Вялікабрытанія), дзе з 18 па 27 ліпеня праходзіла алімпіяда.**

Багдан Ранішэнка на працягу двух гадоў становіцца ўладальнікам дыплома І ступені заключнага этапа рэспубліканскай алімпіяды па хіміі. У гэтым годзе ён заваяваў абсалютнае першае месца, значна апярэдзіўшы ў ведах сваіх сапернікаў. Перамога ў рэспубліканскай алімпіядзе ўжо забяспечыла гомельскаму школьніку аўтаматычнае паступленне ў любую ВНУ краіны. Як мяркуюць ва ўпраўленні адукацыі, дзе ўважліва сочаць за лёсам таленавітай моладзі, вундэркінд з горада над Сожам верагодней за ўсё стане студэнтам БДУ.

Таксама нядаўна з бронзавым медалём 50-й міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы (г. Брэмен, ФРГ) вярнуўся выпускнік Рэчыцкай раённай гімназіі Арцём Говараў.

